*УДК 7.067*

# ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў АРТ-ДЫСКУРСЕ ЧАСОПІСА «МАСТАЦТВА»

***В. М. АДАМАВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Арт-дыскурс часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны разгледжаны як канцэптуальна-дынамічная з'ява. Семіёзіс арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» па вызначанай тэме прадстаўлены на прыкладзе публікацый 1950–80-х гг., прысвечаных жывапісу, кінамастацтву і вакальна-сцэнічнаму мастацтву. Дыскурсіўныя пераартыкуляцыі абазначаны як публіцыстычныя практыкі рэпрэзентацыі гістарычнай памяці праз творы мастацтва.

***Ключавыя словы:*** культурна-гістарычная памяць; арт-дыскурс; семіёзіс; дыскурсіўныя пераартыкуляцыі; аўтарскія інтэнцыі; інтэнцыйныя катэгорыі; культурныя публіцыстычныя практыкі.

# ТЕМА ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В АРТ-ДИСКУРСЕ ЖУРНАЛА «МАСТАЦТВА»

***О. Н. АДАМОВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Арт-дискурс журнала «Мастацтва» в аспекте репрезентации темы Великой Отечественной войны рассмотрен как концептуально-динамическое явление. Семиозис арт-дискурса журнала «Мастацтва» по обозначенной теме представлен на примере публикаций 1950–80-х гг., посвященных живописи, киноискусству и вокально-сценическому искусству. Дискурсивные переартикуляции определены как публицистические практики репрезентации исторической памяти через произведения искусства.

***Ключевые слова:*** культурно-историческая память; арт-дискурс; семиозис; дискурсивные переартикуляции; авторские интенции; интенционные категории; культурные публицистические практики.

# THE THEME OF THE GREAT PATRIOTIC WAR IN THE ART DISCOURSE OF THE MAGAZINE «MASTACTVA»

***O. N. ADAMOVA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The article considers the art discourse of the magazine «Mastactva» in the aspect of representing the theme of the Great Patriotic War as a conceptually dynamic phenomenon. The semiosis of the art discourse of the magazine «Mastactva» on the designated topic is presented on the example of publications devoted to painting, cinematography and vocal

**Образец цитирования:**
Адамава ВМ. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў арт-дыскурсе часопіса «Мастацтва». *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2024;2:47–54.
EDN: ODVGZX

**For citation:**
Adamova ON. The theme of the Great Patriotic War in the art discourse of the magazine «Mastactva». *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2024;2:47–54. Belarusian.
EDN: ODVGZX

**Автор:**
***Ольга Николаевна Адамова*** – аспирантка кафедры литературно-художественной критики факультета журналистики. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Л. П. Саенкова-Мельницкая.

**Author:**
***Olga N. Adamova***, postgraduate student at the department of literary and artistic criticism, faculty of journalism.
*adamovadamik@gmail.com*

CC BY NC

and scenic art in the period of the 1950–80s. Discursive reinterpretations are defined as the biblical practices of representing historical memory through works of art.

***Keywords*****:** cultural and historical memory; art discourse; semiosis; discursive reinterpretations; author's intentions; intentional categories; cultural biblical practices.

## Уводзіны

У стварэнні культурна-гістарычнай памяці прымаюць удзел сацыяльныя інстытуты, у тым ліку СМІ. Асаблівае месца ў мадэляванні культурна-гістарычнай памяці займае мастацтва. Менавіта яно фарміруе эмацыянальны аспект памяці і рэпрэзентуе сістэму каштоўнасцей. У 2024 г. часопіс «Мастацтва», адзінае ў краіне спецыялізаванае грамадска-асветніцкае выданне па выяўленчым мастацтве, фатаграфіі, музыцы, тэатру, кіно, з нагоды святкавання 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў сумесна з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў распачаў праект «За дзень наступны ўсяе зямлі». Намаганнямі ўдзельнікаў праекта творы беларускіх мастакоў, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, «ажываюць»: праз QR-код чытачы паглыбляюцца ў прастору карціны, могуць убачыць яе аўдыё-візуальнае ўвасабленне. Дадзены праект, на наш погляд, не толькі стварае актуальнае мастацка-публіцыстычнае асяроддзе, падтрымлівае напрамкі Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024–2026 гады ў аспекце «звароту да традыцыйных культурных каштоўнасцей і традыцый беларускага народа, яго гістарычнага мінулага, гістарычнай памяці»[1] (тут і далей пераклад наш. – *В. А.*), але і рэпрэзентуе часопіс «Мастацтва» як выданне, якое звычайна адлюстроўвае значныя падзеі ў жыцці Рэспублікі Беларусь дзякуючы багатаму вопыту і імкненню да выкарыстання новых сучасных форм як пры стварэнні канцэптуальных матэрыялаў мастацкай крытыкі, так і пры ўзаемадзеянні з чытацкай аўдыторыяй.

Юбілейныя даты прыцягваюць увагу даследчыкаў да адпаведных падзей па многіх прычынах. Перш за ўсё дадзеная акалічнасць звязана з феноменам культурна-гістарычнай памяці, якая захоўвае і ўзнаўляе анталагічна значныя падзеі, што з'яўляюцца сакральнымі і спрыяюць кансалідацыі членаў той ці іншай культуры. Юбілейныя даты, як правіла, становяцца падставай для актуалізацыі закладзеных у іх культурна-гістарычных сэнсаў і сімвалаў, што, у сваю чаргу, стварае новыя напрамкі інтэрпрэтацыі гэтых падзей, асабліва калі яны маюць сувязь з гістарычным мінулым краіны. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе рэпрэзентацыя ў публіцыстычным асяроддзі выклікае навуковую цікавасць даследчыкаў мастацкай крытыкі. Актуальнасць артыкула абумоўлена значнасцю падзей Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі Рэспублікі Беларусь. Намі быў прааналізаваны эмпірычны матэрыял, які яшчэ навукова не ўсвядомлены ў айчыннай гуманітарнай навуцы, што таксама сведчыць пра актуальнасць даследавання. Г. Б. Багданава на прыкладзе часопіса «Мастацтва» разглядае трансфармацыю жанраў у арт-крытыцы і арт-журналістыцы, звяртаючыся да найбольш паказальных публікацый: інфармацыйныя нататкі, агляды выставак, гістарычныя, тэарэтычныя артыкулы, круглыя сталы, рэцэнзіі, творчыя партрэты, «мастацкія дзённікі». Навуковец адзначае змены, што адбыліся ў структуры і тэматыцы выдання ў 1980–90-я гг. і 2000–2013 гг., акцэнтуючы ўвагу на важных для развіцця часопіса «пошуках свайго месца ў інфармацыйнай прасторы» [1, с. 17]. Даследчыца П. А. Піткевіч звяртае ўвагу на трансфармацыю візуальнага стылю часопіса «Мастацтва», якая праходзіла з 2010 па 2017 г. «у сувязі з уздзеяннем масмедыя на рэдактарскую палітыку выдання» [2, с. 467]. У межах дадзенай працы арт-дыскурс часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны разглядаецца як канцэптуальна-дынамічная з'ява, як «роздум над сэнсам чалавечага быцця ў кантэксце памяці пра Вялікую Айчынную вайну, увасоблены ў карціне, гравюры, скульптуры, тэатральнай пастаноўцы ці мастацкай і дакументальнай кінастужцы» [3, с. 3].

## Матэрыялы і метады даследавання

За 40 гадоў свайго існавання (1983–2023) часопіс «Мастацтва» назапасіў багаты вопыт рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны, размяшчаючы на сваіх старонках рознааспектную інфармацыю пра творчае ўсведамленне і творчую інтэпрэтацыю гэтых трагічных падзей нацыянальнай гісторыі. У выданні друкаваліся рэпартажныя фатаграфіі і кадры кінахронікі, плакаты, творы жывапісу, графікі, скульптуры, манументальнага мастацтва, успаміны і дзённікавыя запісы творчых асоб (удзельнікаў вайны, «дзяцей» і «ўнукаў» вайны), аналізавалася асэнсаванне разглядаемай тэмы ў музычных, тэатральных творах і творах кінамастацтва.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца асаблівасці рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў арт-дыскурсе часопіса «Мастацтва», прадметам – архітэктоніка і семіёзіс арт-дыскурса дадзенага выдання ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай

[1] О Концепции развития национального культурного пространства во всех сферах жизни общества на 2024–2026 годы [Электронный ресурс]. URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300961 (дата обращения: 12.04.2024).

вайны. Пры вывучэнні гістарычнай памяці метадалагічнай базай даследавання выступалі традыцыйныя навуковыя метады (бібліяграфічны, дыскурс-аналіз, дыскурсіўна-структурны аналіз, кантэнт-аналіз, інтэнцыйны аналіз) і падыходы (структура-функцыянальны, фенаменалагічны, інфармацыйны, культурна-семіятычны) [4].

У межах дадзенага даследавання, безумоўна, прэваліруюць дыскурс-аналіз і культурна-семіятычны падыход. Дыскурс-аналіз дазваляе ўлічваць гістарычную і культурную абумоўленасць спосабаў разумення і рэпрэзентацыі гістарычных падзей на старонках часопіса «Мастацтва» праз публікацыю мастацкіх твораў і зварот да ўспамінаў, дзённікавых запісаў дзеячаў культуры. Культурна-семіятычны падыход выкарыстоўваецца для вывучэння тэкстаў, у тым ліку публіцыстычных, «як носьбітаў гістарычнай памяці, спосабаў іх кадзіравання і аналізу культурных практык» [4, с. 76]. Публікацыі часопіса «Мастацтва», прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны, разглядаюцца намі як «мадэлі культурнай камунікацыі, дыялог паміж гісторыяй і сучаснасцю» [5]. Дыскурсіўна-структурны аналіз і кантэнт-аналіз дазволілі разгледзець арт-дыскурс выдання ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны з пункту гледжання яго архітэктонікі, узяўшы за аснову вызначэнне французскага філосафа М. Фуко. Згодна з яго тэорыяй дыскурс ствараецца «дыскурсіўнымі фармацыямі – матэрыяльнымі структурамі як знешнім праяўленнем сістэмы ведаў і інфармацыйнымі структурамі, якія рэпрэзентуюць спецыфічныя веды як адно цэлае, дэтэрмінаванае архетыпнымі, глыбіннымі ўстаноўкамі» [6, с. 16].

Семіёзіс арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах мастацтва разгледжаны згодна з функцыянальным падыходам да вывучэння дыскурсу, даследаваннем яго дынамікі «як сукупнасці аб'ектаў-разнавіднасцей, у якіх рэальна адбываюцца развіццё і спецыфікацыя ведаў», дзе дыскурс аналізуецца як адкрытая сістэма, структура якой у выніку перааартыкуляцыі набывае зменны ў часе характар (назіраецца мадыфікацыя спосабу абазначэння і інтэрпрэтацыі) [6, с. 16].

## Вынікі і іх абмеркаванне

Сёння навукоўцы звяртаюць увагу на «маральную адказнасць СМІ ў захаванні памяці аб вайне як сэнсавызначальнай падзеі для нацыянальнага лёсу» [7, с. 30].

Таксама ў даследаваннях, прысвечаных перыядычным выданням, падкрэсліваецца, што менавіта СМІ выступаюць адным «з галоўных інструментаў перадачы культурнай і гістарычнай памяці» [8, с. 263]. Вызначаюцца наступныя прычыны з'яўлення матэрыялаў па тэме Вялікай Айчыннай вайны: адзначэнне памятнай даты (гадавіны, свята, юбілею), правядзенне культурнага мерапрыемства (выставы, фестывалю, адкрыцця мемарыяла), публікацыя інтэрв'ю са спецыялістам з пэўнай галіны навукі, культуры; апісанне падзеі сведкам [8, с. 263].

На старонках часопіса «Мастацтва» прадстаўлены ўсе вышэйзгаданыя прычыны звароту да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Арт-дыскурс выдання можа быць разгледжаны як традыцыйная канцэптуальна-дынамічная з'ява ў мастацкай крытыцы. Падчас даследаванні часопіса намі былі вызначаны наступныя дыскурсіўныя фармацыі: матэрыяльныя структуры архітэктонікі арт-дыскурсу ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны (тэматычныя нумары, рубрыкі, загалоўкі) і інфармацыйныя структуры (аўтарскія інтэнцыі, інтэнцыйныя катэгорыі).

Для часопіса тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца абавязковай, традыцыйнай. Але тэматычныя нумары ствараліся толькі з нагоды святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (Вайна ў люстры часу. 2009. № 6) і 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (Артхроніка вайны і Перамогі. 2010. № 5). Тэма Вялікай Айчыннай вайны разнастайна прадстаўлена ў рубрыках часопіса: канкрэтна ў нумарах 1980-х гг. («Беларускія артысты на франтах Вялікай Айчыннай», «Да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «Мастацкі летапіс Перамогі») і апасродкавана ў публікацыях 2000-х гг. («Культурны пласт», «Працэс», «Дыскурс», «Знакі часу»). Цікавым падаецца вопыт выкарыстання рубрыкі-анкеты «Які мастацкі твор на тэму Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца для вас знакавым?» (Мастацтва. 2014. № 5), у якой навукоўцы, мастакі, мастацтвазнаўцы выказалі сваё меркаванне. Такі фармат можна ўводзіць і зараз як форму ўзаемадзеяння з чытацкай аўдыторыяй для прадстаўлення грамадскай думкі і разгляду новых мастацкіх твораў, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай вайны.

Сярод загалоўкаў, якія ўваходзяць у матэрыяльную частку архітэктонікі арт-дыскурсу часопіса, выдзелім загаловак-лозунг, загаловак-зварот («Памяць абавязвае, памяць патрабуе» (Мастацтва. 1984. № 5); «Няма гісторыі – няма народа» (Мастацтва. 2023. № 5)); загаловак-хроніку («Памяць вечная, памяць жывая. Вялікая Айчынная вайна ў творах беларускіх кінематаграфістаў», «Беларускія тэатры ў гады Вялікай Айчынная вайны» (Мастацтва. 1984. № 5)); загаловак-канстатацыю, загаловак-рэзюмэ («Асэнсаванне праўды. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і кінематограф» (Мастацтва. 1985. № 5), «Драма, прыпавесць, споведзь. Інтэрпрэтацыя тэмы вайны ў нацыянальным кіно» (Мастацтва. 2014. № 6)).

Інфармацыйныя структуры (інтэнцыйныя катэгорыі, аўтарскія інтэнцыі) арт-дыскурсу часопіса

«Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны разгледзім на прыкладзе публікацый мастацтвазнаўца, крытыка Б. А. Крэпака. Яму належаць наступныя словы: «Калі ідзе вайна – не да муз, не да мастацтва, не да эстэтычных перажыванняў. Але беларускае выяўленчае мастацтва, прысвечанае Вялікай Айчыннай вайне, на мой погляд, сцвярджае іншае… Дзясяткі мастакоў не толькі з аўтаматамі і вінтоўкамі змагаліся з ворагам, але і адшуквалі паміж баямі час, каб маляваць тое, што адбывалася на іх вачах на франтах і ў партызанскіх лясах. А для многіх маладых франтавікоў тэма подзвігу народа стала пасля перамогі галоўнай у творчасці» [9, с. 25]. Словы Барыса Аляксеевіча, сябра многіх мастакоў, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, двойчы лаўрэата нацыянальнай прэміі «За духоўнае адраджэнне», лаўрэата прэміі Беларускага саюза журналістаў, падкрэсліваюць актуальнасць звароту да асаблівасцей рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны з пункту гледжання прадстаўлення традыцый нацыянальнага мастацка-публіцыстычнага асэнсавання гэтай значный гістарычнай падзеі.

Раскрыццё канцэптуальнай пазіцыі аўтара – адзін з ключавых напрамкаў навуковага пошуку даследчыкаў журналістыкі. На нашу думку, найбольш перспектыўны для яе высвятлення кагнітыўна-функцыянальны падыход, у прыватнасці інтэнцыйны аналіз, які выкарыстоўваецца ў медыялінгвістыцы. Як адзначае Н. І. Клушына, «з'яўленне тэкста вызначаецца аўтарскай інтэнцыяй»[2], якая, у сваю чаргу, «характарызуе не свядомасць аўтара, а мэтавую ўстаноўку выказвання або тэксту як адзінага цэлага» [10, с. 24].

Аўтарская інтэнцыя – гэта намер аўтара, асноўная мэта, якую ён дасягае сваім паведамленнем[3]. Тэкст разглядаецца як сацыяльнае дзеянне, і менавіта інтэнцыйныя катэгорыі становяцца тэкстастваральнымі. Для публіцыстычнага тэксту характэрна парадыгма інтэнцыйных катэгорый, якія забяспечваюць рэалізацыю аўтарам камунікатыўнай стратэгіі. Разуменне аўтарскіх інтэнцый і стратэгій, выяўленне камунікатыўнай прагматыкі публіцыстычнага тэксту дазваляюць вызначыць істотныя прыметы журналісцкай дзейнасці. У адносінах да медыятэксту гэта задача спрашчаецца, бо яго аўтар «не ўмоўны вобраз мастацкага твора (апавядальнік, лірычны герой і г. д.), ад імя якога вядзецца аповед, а "сапраўдная" канкрэтная асоба са свам густам і меркаваннем» [11, с. 18].

У межах дадзенага даследавання былі разгледжаны публікацыі Б. А. Крэпака ў часопісе «Мастацтва» за 2009–2024 гг. Найбольш падрабязна вывучаліся наступныя артыкулы: «Колер змагання – колер Перамогі» (Мастацтва. 2009. № 9), «Вайна. Твары і творы: скрозь прызму гадоў» (Мастацтва. 2015. № 5), «Паветраны ас з почыркам мастака: Герой Савецкага Саюза Міхаіл Зялёнкін» (Мастацтва. 2024. № 1), «Як юны партызан Ваня Стасевіч стаў сынам палка» (Мастацтва. 2024. № 2). Намі праведзены кантэнт-аналіз дадзеных артыкулаў і вызначаны наступныя мэтавыя ўстаноўкі, якія характарызуюць аўтарскія інтэнцыі ў рэпрэзентацыі ваеннай тэматыкі:

- спасціжэнне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў нацыянальным і агульначалавечым кантэксце, стварэнне «сусветнай палітры памяці – візуальнага напаміну» пра тое, якія беды, няшчасці і пакуты нясе чалавецтву вайна;
- захаванне нацыянальнай мастацкай «унутранай памяці», якая з'яўляецца «лагічнай заканамернасцю ў дынаміцы развіцця ваенна-патрыятычнай тэмы ў нацыянальным мастацтве» [9, с. 25];
- зварот да тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці па наказе душы і сэрца;
- змяшчэнне акцэнтаў з метафарычных абагульненняў і фармальна-кампазіцыйных прыёмаў на апавядальныя, жыццёвыя канцэпцыі, якія «перадаюць пачуццёвы рух жыцця» [3, с. 3];
- рэпрэзентацыя тэмы Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне як выніку «доўгачаканай барацьбы мільёнаў», а не «імгненнага бліскучага набытку» [9, с. 26];
- прадухіленне разрыву з духоўнымі каштоўнасцямі папярэдніх пакаленняў, «аслаблення пачуцця дачынення моладзі да жыцця сваіх продкаў, якія абаранілі краіну ад карычневай чумы» [3, с. 3];
- захаванне гуманістычных традыцый у нацыянальнай выяўленчай культуры, якая «з'яўляецца моцным духоўным акумулятарам чалавечых арыенціраў на шляху ў светлы заўтрашні дзень – без войнаў, рэвалюцый, гвалту, сацыяльных і рэвалюцыйных канфліктаў» [3, с. 3].

Сярод інтэнцыйных катэгорый, якія забяспечваюць напісанне аўтарам матэрыялаў абранай камунікатыўнай стратэгіі, можна вылучыць наступныя: асоба, гісторыя, барацьба, час, маральнасць як «сацыяльнае сумленне», асвечанае надзеяй, дарога, «якая вядзе да велічнага мемарыяла, помніка або сціплага абеліска» [9, с. 26], маўклівасць, самота, цішыня «у мікрасвеце мастакоў-ветэранаў» [3, с. 2], ваенныя лёсы беларускіх мастакоў (франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў)[4].

У публікацыях іншых аўтараў часопіса «Мастацтва» таксама можна знайсці адзначаныя інтэнцыйныя катэгорыі, што, на нашу думку, указвае на пэўную тра-

[2]*Клушина Н. И.* Интернациональные категории публицистического текста в аспекте коммуникативной стилистики (на материалах юридических изданий) : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.01.10. М. : МГУ им. М. В. Ломоносова, 2008. С. 28.
[3]Там же. С. 25.
[4]Апошняя згаданая інтэнцыйная катэгорыя рэалізавана ў выяўленчым праекце часопіса «Мастацтва» (№ 1–5 за 2024 г.), прысвечаным 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

дыцыйнасць у рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны на старонках часопіса. Асобна трэба вылучыць матэрыялы, прысвечаныя манументальнаму мастацтву. Так, у артыкуле П. Вайніцкага «Месцы памяці ў грамадскай прасторы. Сучасныя мемарыялы генацыду» (Мастацтва. 2017. № 5) з'яўляецца інтэнцыйная катэгорыя «месца памяці», што адсылае да канцэпцыі французскага гісторыка П. Нара, які называе манументы, помнікі, скульптуры, прысвечаныя гістарычным падзеям, «лакацыямі прысутнасці мінулага ў сучасным, месцамі, дзе пераплятаюцца калектыўная гісторыя (факталагічная рэпрэзентацыя мінулага) і памяць (актуальнае ўспрыманне гэтага мінулага чалавечымі супольнасцямі)» [12, с. 5]. Таксама ў згаданым артыкуле сустракаецца інтэнцыйная катэгорыя «нацыянальная культура памяці». Яна раскрываецца аўтарам праз нацыянальную традыцыю адкрыцця мемарыялаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны з мэтай захавання месцаў трагічных падзей у публічнай прасторы і памяці: «…сродкамі мастацтва ствараецца пачуццёвае асяроддзе, дзе з дапамогай архітэктурных формаў і мастацка-прасторавых кампазіцый чалавек трапляе ў аб'ект мемарыялізацыі і перажывае гістарычныя падзеі на ўласным досведзе» [12, с. 7]. У інтэрв'ю з народным мастаком Беларусі І. Міська месцы памяці служаць для ўшанавання «памяці канкрэтных людзей канкрэтнай эпохі і праз іх – падзвігу народа» [13, с. 18]. Вядомы беларускі скульптар вызначае важную інтэнцыю ў рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў медыйнай мастацтвазнаўчай прасторы – уключанасць кожнага пакалення ў сваю вайну і адказнасць кожнага чалавека за тое, што адбываецца ў свеце: «Кожнае пакаленне мае сваю вайну, больш ці менш крывавую і страшную, але ў любым выпадку жудасную… разуменне, што ўсе людзі – адна сям'я, і праблема кожнага – гэта непазбежна праблемы ўсіх, павінна прыйсці да нас з Космасу» [13, с. 19].

Разглядаючы арт-дыскурс часопіса «Мастацтва» як сукупнасць публіцыстычных тэкстаў, якія ствараюць «галіну спецыфічнай сацыякультурнай дзейнасці» [14, с. 47], і матэрыялы выдання як узведзеныя ў рэальнасць уяўленні рэцыпіентаў пра разнастайныя падзеі і з'явы [14, с. 182], прадставім семіёзіс арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» ў межах пераартыкуляцыі (абазначэння, інтэрпрэтацыі) тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах мастацтва [6, с. 16]. Паколькі публіцыстычныя тэксты ў навуковых даследаваннях разглядаюцца як сацыяльныя дзеянні [14, с. 92], у аснову класіфікацыі вызначаных пераартыкуляцый намі пакладзены вынікі сацыялагічных даследаванняў [15], дзе выдзелены чатыры пакаленні, розныя па сваіх адносінах да Вялікай Айчыннай вайны і вызначэнні яе ролі ў свядомасці людзей. Сацыёлагі Д. Г. Ротман і Г. А. Шыраканава прапануюць наступную класіфікацыю пакаленняў па крытэрыі ўспрыняцця гэтых трагічных падзей айчыннай гісторыі:

- ваеннае пакаленне. Яго прадстаўнікі ўспрымаюць вайну як трагедыю, імі яшчэ не забыты жах перажытага. Мірнае жыццё выступае як абсалютная каштоўнасць, захоўваецца аўтарытэт воінаў-вызваліцелей, армія з'яўляецца найбольш арганізаванай і паважанай часткай грамадства;
- пакаленне першых пасляваенных гадоў (канец 1940 – пачатак 1960-х гг.) – дзеці ваеннага пакалення. Для гэтых людзей вайна – падзея блізкая і рэальная. Яны ведаюць пра вайну з аповедаў родных і сваякоў і імкнуцца да ўмацавання новай мірнай сістэмы каштоўнасцей;
- пакаленне брэжнеўскай эпохі (канец 1960-х – пачатак 1980-х гг.). Вялікая Айчынная вайна ўспрымаецца прадстаўнікамі гэтага пакалення як падзея ў гісторыі савецкай краіны. Яны атрымліваюць звесткі пра вайну з твораў мастацтва, успамінаў ветэранаў, бачаць матэрыяльныя сведчанні вайны (акопы, снарады, магілы). Дадзенае пакаленне характарызуецца цікавасцю да ваенных падзей без непасрэднага эмацыянальна-асабістага ўспрымання і маральна-каштоўнаснага ўсведамлення;
- сучаснае пакаленне (канец 1980-х – пачатак 2000-х гг.). Уяўленні гэтага пакалення пра Вялікую Айчынную вайну няпэўныя. Крыніцай звестак пра вайну выступаюць афіцыйныя мерапрыемствы, а не асабісты жыццёвы вопыт яе ўдзельнікаў. Вайна ўспрымаецца як знешняя з'ява, не звязаная цесна з рэчаіснасцю [15].

Тым не менш даследаванні, праведзеныя Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў 2020 г., сведчаць, што «70 % рэспандэнтаў лічаць Вялікую Айчынную вайну і перамогу ў ёй найбольш значнай падзеяй у навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь» [16].

Аналіз публікацый часопіса «Мастацтва» паказаў, што падрабязна і грунтоўна асаблівасці рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах мастацтва выявіліся ў наступныя перыяды: 1950–60-я гг., 1960–70-я гг., 1970–80-я гг. Найбольш поўна семіёзіс арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» ў межах пераартыкуляцыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах мастацтва прадстаўлены ў артыкулах, прысвечаных жывапісу, кінамастацтву і вакальна-сцэнічнаму мастацтву. Вынікі даследавання абазначанай тэмы прыведзены ў табліцы. Матэрыялы для табліцы ўзяты з наступных публікацый: Г. Сачанка «Спадчыннасць», В. Чанін «Летапіс неўміручага подзвігу», М. Ганчароў «Гімн усенароднай мужнасці» (Мастацтва. 1985. № 5), Л. Пінчук «Памяць вечная, памяць жывая» (Мастацтва. 1986. № 6), А. Сідарэнка «Не толькі пра кіно» (Мастацтва. 2009. № 5), А. Сідарэнка «Трэцяе пакаленне» (Мастацтва. 2010. № 5), М. Эрэнбург «Суровы стыль трагічнай эпохі» (Мастацтва. 2011. № 5), А. Бабкова «Саракавыя, ракавыя…» (Мастацтва. № 5. 2011), М. Грамыка «Краявід пасля бітвы» (Мастацтва. 2012. № 5), Л. Грамыка «Шчымлівыя ноты вайны» (Мастацтва. 2013. № 5), Л. Саянкова «Драма, прыпавесць, споведзь» (Мастацтва. 2014. № 5).

**Семіёзіс тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў арт-дыскурсе часопіса «Мастацтва» (рэпрэзентацыя ў творах мастацтва 1950–80-х гг.)**

**Semiosis of the theme of the Great Patriotic War in art discourse of the magazine «Mastactva» (representation in works of 1950–80s)**

| Перыяд | Дыскурсіўныя пераартыкуляцыі | | |
|---|---|---|---|
| | Жывапіс | Кінамастацтва | Вакальна-сцэнічнае мастацтва |
| 1950–60-я гг. | Характарыстыкі:<br>• напасрэдны водгук на падзеі;<br>• археэпічныя сюжэты (трагедыя гібелі героя, супрацьстаянне);<br>• горыч страт;<br>• драматычныя калізіі бою;<br>• бедствы вайны і акупацыі;<br>• партызанскі эпас;<br>• жыццёвыя, маральныя і філасофскія аспекты вайны | Характарыстыкі:<br>• героіка-патрыятычны пафас;<br>• выразныя маральныя акцэнты;<br>• атмасфера напружанага дзеяння, педаадолення перашкод;<br>• увага да чалавека (абагульнены партрэт чалавека на вайне);<br>• метафізіка ўчынкаў, подзвігу | Характарыстыкі:<br>• увасабленне подзвігу;<br>• паслядоўны паказ таго, што адбывалася;<br>• ужыванне вострых і эмацыянальных выказванняў;<br>• паказ знешніх бакоў падзей;<br>• выкарыстанне ілюстратыўнасці;<br>• недакладнае спалучэнне музычнага матэрыялу з тэмай |
| 1960–70-я гг. | Характарыстыкі:<br>• асобасная афарбоўка мастацкага выказвання, глыбокі філасофскі сэнс падзей;<br>• сувязь часоў, абагульненне і публіцыстычнасць;<br>• суб'ектывізм;<br>• драма пераломаў чалавечых лёсаў, расстанняў з роднымі;<br>• паўсядзённая гераічнасць народа;<br>• манументалізацыя, метафарызацыя, эмацыйнае ўражанне | Характарыстыкі:<br>• эмацыянальна-асабістае, аўтарскае асэнсаванне вайны;<br>• пошук ў ваенным мінулым прычын фарміравання характараў;<br>• станаўленне маральных імператываў;<br>• выкарыстанне прыёму асабістай споведзі;<br>• усхваленне чалавека, прыгажосці пачуццяў | Характарыстыкі:<br>• асвятленне псіхалагічнага, філасофскага аспектаў;<br>• дэманстрацыя сувязі учарашняга дня з сённяшнім днём, з будучыняй чалавецтва;<br>• узаемапранікненне канкрэтнага і абагульненага, цяперашняга і вечнага;<br>• узмацненне ролі драматургічнага кантрасту;<br>• выкарыстанне «прасветленага» эмацыянальнага тонусу ў музычных творах |
| 1970–80-я гг. | Характарыстыкі:<br>• абуджэнне цікавасці да дакументальных падрабязнасцей, імкненне вярнуцца ў мінулае, адчуць яго ва ўсёй праўдзівасці;<br>• паказ вайны як трагічнага парушэння жыццёвай гармоніі | Характарыстыкі:<br>• маштабнасць падзей;<br>• жыццё ў час вайны;<br>• вызначальны канцэпт мірнага жыцця;<br>• дакументалізм | Характарыстыкі:<br>• драматычны роздум;<br>• вобраз народа-ўдзельніка ваенных падзей;<br>• дакументалізм;<br>• героіка-патрыятычная тэма |

Па матэрыялах табліцы прасочым дынаміку арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў мастацкіх творах. Вылучым агульныя рысы для кожнага перыяду, якія знаходзяць увасабленне ў жывапісе, кінамастацтве і вакальна-інструментальным мастацтве: наяўнасць героіка-патрыятычнага пафасу, адлюстраванне подзвігу, адчуванне горычы страт (1950–60-я гг.); эмацыянальна-асабістае, аўтарскае асэнсаванне вайны, зварот увагі на чалавека і яго пачуцці (1960–70-я гг.); дамінаванне дакументалізму, імкненне наблізіцца да эпохі, падзей, асоб герояў (1970–80-я гг.). Як бачым, суцэльнага супадзення ў перыядызацыі сацыёлагаў і мастацкіх крытыкаў не назіраецца, аднак можна адзначыць, што ва ўсведамленні эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны соцыум і мастацтвазнаўчая медыйная прастора прайшлі і праходзяць агульны шлях ад непасрэднага ўспрыняцця падзей сведкамі і іх нашчадкамі да драматычнага роздуму над гістарычным вопытам. Такая тэндэнцыя назіраецца і ў публікацыях часопіса «Мастацтва» за 2024 г. «На жаль, пра тую вайну сённяшняе маладое пакаленне ведае вельмі павярхоўна. А адкуль узяцца патрыятызму, калі дарослыя і тыя не заўсёды могуць разабрацца ў падзеях, асабліва ў час інфармацыйных войнаў? На якіх прыкладах павінна вучыцца патрыятызму моладзь?.. Памятаць тых, хто здзейсніў бессмяротны подзвіг у імя жыцця, у імя Бацькаўшчыны, памятаць урокі гісторыі, памятаць у імя сябе – вось галоўная мэта, якая стаіць сёння перад грамадствам незалежнай Беларусі» [3, с. 3].

Прыведзеныя дыскурсіўныя пераартыкуляцыі могуць быць абазначаны ў якасці культурных публіцыстычных практык рэпрэзентацыі твораў мастац-

тва як носьбітаў гістарычнай памяці згодна з культурна-семіятычным падыходам да вывучэння мастацкага ўвасаблення тэмы Вялікай Айчыннай вайны, служыць прыкладам культурнай камунікацыі і падмуркам далейшага развіцця мастацкай крытыкі ў напрамку ўсведамлення і інтэрпрэтацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, вырашаючы праблему захавання гістарычнай памяці, разнастайнасці тыпаў ведаў пра мінулае, перадачы назапашанага вопыту [17].

## Заключэнне

Нацыянальная культура Рэспублікі Беларусь, у якой знайшлі адлюстраванне падзеі ваенных гадоў, – гэта каштоўнасць, сродак захавання і развіцця гуманістычнай свядомасці беларусаў. Значнае месца ў гэтым развіцці належыць спецыялізаваным выданням пра мастацтва як носьбітам традыцый, умяшчальні выключных матэрыялаў па гісторыі мастацтва, дзённікавых запісаў і ўспамінаў дзеячаў мастацтва нашай краіны.

Арт-дыскурс часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны разгледжаны як канцэптуальна-дынамічная з'ява. У публікацыях выдання прадстаўлены эмацыянальны аспект памяці і сістэма гуманістычных, антываенных каштоўнасцей як узоры канцэптуальнай мастацкай крытыкі. Матэрыялы часопіса «Мастацтва», прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны, разгледжаны намі як прыклад культурнай камунікацыі, дыялог паміж гісторыяй і сучаснасцю. У аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны тэматычныя нумары, рубрыкі, загалоўкі прадстаўлены ў матэрыяльнай структуры архітэктонікі арт-дыскурсу. Аўтарскія інтэнцыі і інтэнцыйныя катэгорыі вылучаны як інфармацыйныя структуры. Семіёзіс арт-дыскурсу часопіса «Мастацтва» ў аспекце рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах мастацтва даследуецца на прыкладзе публікацый, прысвечаных жывапісу, кінамастацтву і вакальна-сцэнічнаму мастацтву 1950–80-х гг. Разгледжаныя аўтарскія інтэнцыі рэпрэзентацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны дазваляюць вылучыць найбольш істотныя прыметы дзейнасці аўтараў часопіса, якія ў сваіх артыкулах сцвярджаюць неабходнасць няспыннага звароту да ваеннай тэматыкі як у мастацкай творчасці, так і ў публіцыстыцы з мэтай захавання традыцый нацыянальнага мастацка-публіцыстычнага асэнсавання гэтай значный гістарычнай падзеі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Багданава ГБ. Мастак выходзіць з ценю. Трансфармацыя жанраў у выяўленчым мастацтве, арт-крытыцы і арт-журналістыцы. В: Саенкова ЛП, редактор. *Трансформация жанров в литературно-художественной критике. Выпуск 4.* Минск: БГУ; 2013. с. 16–26.

2. Питкевич ПА. Эволюция визуальности в журнале «Мастацтва» 2010-х годов. В: Сафонов ВГ, редактор. *75-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета. Материалы 75-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета; 14–23 мая 2018 г.; Минск, Беларусь. Часть 3.* Минск: БГУ; 2018. с. 466–469.

3. Крэпак БА. Яны змагаліся за Радзіму. *Мастацтва.* 2024;1:2–3.

4. Матусевич ОА. Основные подходы к изучению исторической памяти белорусов: проблемы, достижения и перспективы. *Труды БГТУ. Серия 6, История, философия.* 2017;2:74–78.

5. Лотман ЮМ. *Внутри мыслящих миров. Человек – текст – семиосфера – история.* Москва: Языки русской культуры; 1999. с. 302.

6. Фуко М. *Слова и вещи: археология гуманитарных наук.* Визгин ВП, Автономова НС, переводчики. Санкт-Петербург: A-cad; 1994. 408 с.

7. Падаляк ТВ. Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце аксіялагічных выклікаў часу. У: Дубовік СВ, рэдактар. *Журналістыка–2015: стан, праблемы і перспектывы. Матэрыялы 17-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 12–13 лістапада 2015 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: БДУ; 2015. с. 29–32.

8. Бурлакова АВ. Культурная память в СМИ: репрезентация Великой Отечественной войны (1941–1945) на страницах «СБ. Беларусь сегодня» и «АиФ». В: Федотова НА, редактор. *Мультимедийная журналистика: медиакоммуникации и медиаиндустрия. Материалы II Международной научно-практической конференции; 1 марта 2019 г.; Минск, Беларусь.* Минск: БГУ; 2019. с. 261–265.

9. Крэпак БА. Колер змагання – колер Перамогі. *Мастацтва.* 2009;9:24–27.

10. Дускаева ЛР, Цветова НС. Интенциональный анализ как вектор развития. *Журналистика и культура русской речи.* 2012;4:18–33.

11. Солганик ГЯ. К определению понятия «текст» и «медиатекст». *Вестник Московского университета. Серия 10, Журналистика.* 2005;2:17–19.

12. Вайніцкі ПУ. Месцы памяці ў грамадскай прасторы. Сучасныя мемарыялы генацыду. *Мастацтва.* 2017;5:5–7.

13. Міско І. Няма гісторыі – няма народа. *Мастацтва.* 2022;5:18–19.

14. Іўчанкаў ВІ. *Дыскурс беларускіх СМІ: арганізацыя публіцыстычнага тэксту.* Мінск: БДУ; 2003. 257 с.

15. Ротман ДГ. Великая Отечественная война в сознании разных поколений белорусов. *Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права.* 2005;2:74–79.

16. Кохановский АГ. Великая Отечественная война в исторической памяти белорусов. В: Кохановский АГ, редактор. *Пичетовские чтения – 2020: войны в истории человечества. К 75-летию Победы над фашизмом. Материалы Международной научно-практической конференции; 21 октября 2020 г.; Минск, Беларусь*. Минск: БГУ; 2020. с. 101–104.
17. Мысливец НЛ. Великая Отечественная война в исторической памяти молодежи: социологический анализ. *Философия и социальные науки*. 2015;4:23–29.

## References

1. Bogdanava GB. [The artist comes out of the shadows. Transformation of genres in fine art, art criticism and art journalism]. In: Saenkova LP, editor. *Transformatsiya zhanrov v literaturno-khudozhestvennoi kritike. Vypusk 4* [Transformation of genres in literary and artistic criticism. Issue 4]. Minsk: Belarusian State University; 2013. p. 16–26. Belarusian.
2. Pitkevich PA. [Evolution of the visualisations in the magazine «Mastactva» of 2010s]. In: Safonov VG, editor. *75-ya nauchnaya konferentsiya studentov i aspirantov Belorusskogo gosudarstvennogo universiteta. Materialy 75-i nauchnoi konferentsii studentov i aspirantov Belorusskogo gosudarstvennogo universiteta; 14–23 maya 2018 g.; Minsk, Belarus'. Chast' 3* [75th scientific conference of students and postgraduate students of the Belarusian State University. Materials of the 75th scientific conference of students and postgraduate students of the Belarusian State University; 2018 May 14–23; Minsk, Belarus. Part 3]. Minsk: Belarusian State University; 2018. p. 466–469. Russian.
3. Krjepak BA. [They fought for the Motherland]. *Mastactva*. 2024;1:2–3. Belarusian.
4. Matusevich OA. Basic approaches to the study of the historical memory of Belarusians: challenges, achievements and prospects. *Proceedings of BSTU. Issue 6, History, Philosophy*. 2017;2:74–78. Russian.
5. Lotman YuM. *Vnutri myslyashchikh mirov. Chelovek – tekst – semiosfera – istoriya* [Inside thinking worlds. Man – text – semiosphere – history]. Moscow: Yazyki russkoi kul'tury; 1999. p. 302. Russian.
6. Foucault M. *Slova i veshchi: arkheologiya gumanitarnykh nauk* [Words and things: archaeology of the humanities]. Vizgin VP, Autonomova NS, translators. Saint Petersburg: A-cad; 1994. 408 p. Russian.
7. Padaljak TV. [The Great Patriotic War in the context of axiological challenges of the time]. In: Dubovik SV, editor. *Zhurnalistyka–2015: stan, prablemy i perspektyvy. Matjeryjaly 17-j Mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi; 12–13 listapada 2015 g.; Minsk, Belarus'* [Journalism–2015: state, problems and prospects. Proceedings of the 17th International scientific and practical conference; 2015 November 12–13; Minsk, Belarus]. Minsk: Belarusian State University; 2015. p. 29–32. Belarusian.
8. Burlakova AV. [Cult memory in the media: a representation of the Great Patriotic War (1941–1945) on the pages of «SB. Belarus segodnya» and «AiF»]. In: Fedotova NA, editor. *Mul'timediinaya zhurnalistika: mediakommunikatsii i mediaindustriya. Materialy II Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii; 1 marta 2019 g.; Minsk, Belarus'* [Multi-media journalism: media communications and media industry. Proceedings of the 2nd International scientific and practical conference; 2019 March 1; Minsk, Belarus]. Minsk: Belarusian State University; 2019. p. 261–265. Russian.
9. Krjepak BA. [The colour of struggle is the colour of victory]. *Mastactva*. 2009;9:24–27. Belarusian.
10. Duskaeva LR, Tsvetova NS. [International analysis as a vector of development]. *Zhurnalistika i kul'tura russkoi rechi*. 2012;4:18–33. Russian.
11. Solganik GYa. [To the definition of the concept of «text» and «media text»]. *Vestnik Moskovskogo universiteta. Seriya 10, Zhurnalistika*. 2005;2:17–19. Russian.
12. Vainicki PU. [Places of memory in the public space. Modern genocide memorials]. *Mastactva*. 2017;5:5–7. Belarusian.
13. Misko I. [No history, no people]. *Mastactva*. 2022;5:18–19. Belarusian.
14. Iwchankaw VI. *Dyskurs belaruskih SMI: arganizacyja publicystychnaga tjekstu* [The discourse of the Belarusian mass media: the organisation of a journalistic text]. Minsk: Belarusian State University; 2003. 257 p. Belarusian.
15. Rotman DG. [The Great Patriotic War in the minds of different generations of Belarusians]. *Vesnik Belaruskaga dzjarzhawnaga universitjeta. Seryja 3, Gistoryja. Filasofija. Psihalogija. Palitalogija. Sacyjalogija. Jekanomika. Prava*. 2005;2:74–79. Russian.
16. Kakhanouski AG. [The Great Patriotic War in the historical memory of Belarusians]. In: Kakhanouski AG, editor. *Pichetovskie chteniya – 2020: voiny v istorii chelovechestva. K 75-letiyu Pobedy nad fashizmom. Materialy Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii; 21 oktyabrya 2020 g.; Minsk, Belarus'* [Picheta readings – 2020: wars in the history of mankind. To the 75th anniversary of the Victory over fascism. Proceedings of the International scientific and practical conference; 2020 October 21; Minsk, Belarus]. Minsk: Belarusian State University; 2020. p. 101–104. Russian.
17. Myslivets NL. [The Great Patriotic War in the historical memory of youth: a sociological analysis]. *Filosofiya i sotsial'nye nauki*. 2015;4:23–29. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 27.08.2024.*
*Received by editorial board 27.08.2024.*